# АРХІЎ ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ ЛІТОЎСКАГА ВІТАЎТА КЕЙСТУТАВІЧА Ў ГІСТАРЫЯГРАФІІ

**З. В. Чэчулін**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*zaharchechulin@gmail.com;*
*нав. кір. – А. М. Латушкін, канд. гіст. нав., дац.*

Дадзены навуковы артыкул прысвечаны даследванню праблемы вызначэння дакументальнага складу, а таксама праблемы рэканструявання архіва вялікага князя літоўскага Вітаўта Кейстутавіча ў працах польскіх, літоўскіх, беларускіх, расійскіх і украінскіх даследчыкаў. Каштоўнасць дадзенага артыкула заключаецца ў тым, што ў гістарыяграфіі не існуе ніводнай навуковай працы, у якой былі б дакладна выказаны прапановы наконт вырашэння вышэйпазначаных праблем. Аўтарам дадзенага артыкула было высветлена сучаснае становішча распрацаванасці тэмы дакументальнай спадчыны Вітаўта Кейстутавіча, а таксама пазначана шырокае кола праблем, якія на дадзены момант маюць месца быць у гістарыяграфіі вывучэння пазначанай тэмы. Даследванне будзе карысна дзеля далейшай працы ў галіне архіваў манархаў ВКЛ.

***Ключавыя словы:*** гістарыграфія; Вітаўт; Вялікае Княства Літоўскае; архіў Вітаўта; пісьмовая культура; старажытныя архівы; канцылярыя.

Мэтай даследавання з’яўляецца вызначэнне сучаснага стану распрацоўкі праблемы рэканструкцыі і дакументальнага складу архіва вялікага князя літоўскага Вітаўта. Працы, аб’ектам вывучэння якіх была дакументальная спадчына Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) пачалі з’яўляцца яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя, іх аўтарамі з’яўляліся такія даследчыкі як Г. фон Бунге, І. Даніловіч і інш. [17]. Але сапраўдны прарыў, у вывучэнні архіўнай спадчыны вялікага князя літоўскага Вітаўта зрабіў польскі даследчык А. Прахаска [16]. Тут у першую чаргу неабходна разгледзець яго працу, якая па сутнасці з’яўляецца археаграфічным зборнікам, аднак утрымлівае і гістарыяграфічную частку ў выглядзе прадмовы. Маецца на ўвазе «Codex epistolaris Vitoldi Magni Ducis Lithuaniae». У гэты зборнік акрамя дакументаў архіва Вітаўта, быў ўключаны яшчэ шэраг дакументаў, якія галоўным чынам адносіліся да эпохі актыўнай палітычнай дзейнасці Вітаўта, спачатку як удзельнага князя, а потым як манарха. Імя Вітаўта ў шэрагу апублікаваных дакументаў увогуле не ўпамінаецца, таму назваць дадзенае выданне паўнавартасным тэматычным зборнікам можна дастаткова ўмоўна.

Нягледзячы на гэтую акалічнасць, пазначанае вышэй выданне з’яўляецца фундаментальным для далейшых даследванняў архіва Вітаўта, а таксама рэканструкцыі архіва манарха. На погляд аўтара, гэта

выданне павінна быць перагледжана і перавыдадзена, так як там ёсць шмат памылак і недакладнасцяў. Але справа ў тым, што многія дакументы, апублікаваныя там, не захаваліся ў якасці арыгіналаў, таму праца з гэтым выданнем дазваляе даследчыкам працаваць с вялікай колькасцю гістарычных крыніц.

Наступны перыяд пачынаецца з утварэннем нацыянальнай Польскай дзяржавы (1918 г.). Большасць навуковых артыкулаў па тэме старажытных архіваў выходзіла ў складзе навуковага часопіса «Ateneum Wileńskie». Тут неабходна засяродзіць усю ўвагу на працы К. Саханевіча, У. Сямковіча, Я. Фіялека і інш [31, 32, 34]. Дадзеныя навукоўцы накіравалі сваю ўвагу на такія рэчы як сфрагістыка, крыніцазнаўства, а таксама палеаграфія. Пра прапановы рэканструкцыі архіву Вітаўта ў дадзены перыяд казаць не прыходзіцца. У сацыялістычнай Польшчы, працы наконт старажытных архіваў, і, у прыватнасці архіва Вітаўта з'явіліся не адразу. Толькі ў 60-х гг. XX ст. познаньскі гісторык М. Косман у галіне вывучэння архіва Вітаўта зрабіў істотны зрух, апублікаваўшы шэраг навуковых артыкулаў, якія былі прысвечаны канцылярыі вялікага князя літоўскага, персаналу канцылярыі, фармуляру дакументаў, выходзіўшых з-пад пяра пісараў канцылярыі, а таксама архіву Вітаўта [21–28].

На жаль, М. Косман не пазначыў у сваіх працах, што ён мае на ўвазе пад «архівам Вітаўта». Па яго меркаванню, архіў Вітаўта быў адной з частак вялікакняжацкага скарбу. Даследчык выставіў гіпотэзу аб тым, што большая частка гэтага скарбу (а таксама і дакументы архіву) знаходзілася ў Троках і захоўвалася ў скрынях. У архіве захоўваліся агульнадзяржаўныя акты, адбіраў якія вялікі князь. У склад архіва ўваходзілі аформленыя польскай кароннай канцылярыяй акты уніі, а таксама міжнародныя дамовы, завераныя Вітаўтам самастойна або разам з Уладзіславам II Ягайлам. Па меркаванню М. Космана, копій выходнай дакументацыі не рабілі, аднак ёсць падставы меркаваць, што ў другой палове 20-х гг. XV ст. вялікакняжацкай канцылярыяй быў створаны невялікі аб'ём копій як уваходнай, так і выходнай дакументацыі. Асабліва ў 1429–1430 гг., калі Вітаўт меў магчымасць атрымаць тытул караля.

Пасля М. Космана праблемай канцылярыі і архіва Вітаўта заняліся такія польскія даследчыкі як Е. Ахманьскі, С. Шыбкоўскі і Я. Куртыка [29, 33, 35]. С. Шыбкоўскі ў сваю чаргу больш грунтоўна даследваў персанальны склад канцылярыі, выкарыстаўшы у сваіх працах прасапаграфічны метад. Аднак яго меркаванне, наконт таго, што большая частка архіву загінула ў 1435 г. не пацверджаецца крыніцамі. Хутчэй за ўсё, С. Шыбкоўскі абапіраўся на тое, што ў 30-я г. XV ст. у

ВКЛ ішла грамадзянская вайна. Такім чынам, падчас баявых дзеянняў, у выніку пажару, частка архіва магла быць часткова знішчана [33].

У літоўскіх даследчыкаў, на працягу XX стагоддзя складваліся шэраг накірункаў, якія ў пэўнай ступені закраналі архіў Вітаўта Кейстутавіча. Да гэтых даследчыкаў трэба аднесці К. Яблонскіса [18], да больш пазнейшых – Р. Петраўскаса і Р. Чапайтэ, а таксама Д. Антанавічуса [12, 14, 15]. Петраўскас даследваў канцылярыю Вітаўта, яе службовы склад. Шэраг высноў, якія зрабіў Р. Пятраўскас карысны для наступных даследванняў. Напрыклад на дадзены момант ужо можна аргументавана казаць пра свецкасць канцылярыі Вітаўта, пра яе іерархію. Але даследчык дакладна не высветліў і не паставіў кропку ў пытанні, хто ж быў адказным за захаванне архіва вялікага князя літоўскага Вітаўта – падскарбій, або сакратар, які узначальваў канцылярыю? Тут паўстае пытанне і яго вырашэнне – задача будучыні.

Літоўская даследчыца Р. Чапайтэ звярнула ўвагу на знешнія і палеаграфічныя асаблівасці лістоў канцылярыі Вітаўта. Згодна з яе працамі, можна казаць пра інфільтрацыю ў асабістую прыватную канцылярыю не толькі польскага элементу, а таксама прускага (нямецкага). На гэта паказваюць характэрныя лігатуры і почырк пісараў канцылярыі Вітаўта. Даследчыца ўзгадала пра тое, што копіі дакументаў рабіліся не сістэматызавана і гэтая з’ява характэрная для 20-х гг. XV ст.

Украінскія даследчыкі, да якіх неабходна аднесці В. Бялецкую, а таксама Б.Чэркаса, А. Купчынскага, даследвалі як архівы асобных княстваў (у прыватнасці Галіцка-Валынскага), так і асобныя дакументы канцылярыі Вітаўта. З пункту гледжання метадычных аспектаў, дзеля рэканструкцыі сярэдневечных архіваў, трэба звярнуць увагу на працу А. Купчынскага. Астатнія вышэйпералічаныя даследчыкі выкарысталі ў асноўным толькі крыніцазнаўчы падыход.

Да расійскіх даследчыкаў трэба аднесці Г.Л. Харашкевіч і С.У. Палехава. У сваю чаргу, Г.Л. Харашкевіч вядома як аўтар-складальнік фундаментальнага археаграфічнага зборніка пад назвай «Полоцкие грамоты» [10, 11]. С.У. Палехавым у дачыненні да дакументаў канцылярыі Вітаўта было зроблена шэраг даследванняў. У прыватнасці, навуковец даследваў грамату Вітаўта для Свідрыгайлы. Аднак працы вышэйназваных навукоўцаў не закранаюць архіў Вітаўта як паўнавартасную сістэму.

У беларускай гістарыграфіі спецыяльнае даследванне старажытных архіваў ВКЛ пачалося у канцы XX ст. У прыватнасці, гэтую тэму закранаў у сваёй дысертацыі А.Я. Рыбакоў. Пасля гэтага пачынаюць выходзіць працы А.І. Грушы і А.М. Латушкіна. А.І. Груша даследуе феномен развіцця так званай пісьмовай культуры ў ВКЛ [2, 3]. Гэтая

праца атрымала выйсце ў выглядзе манаграфіі. А.І. Грушам была зроблена наступная выснова – развіццю пісьмовай культуры ў ВКЛ спрыяла актыўная інфільтрацыя польскага элементу. З гэтым неабходна пагадзіцца, таму што канцылярыя каралеўства польскага як раз такі моцна паўплывала на генэзіс прыватнай канцылярыі Вітаўта. Увогуле персанал канцылярыі Вітаўта, у большасці лаціна-нямецкага аддзелу складалі менавіта ўраджэнцы польскага каралеўства. Паколькі даследчык ставіў перад сабою іншую мэту, архіву Вітаўта ў даследванні не было нададзена шмат увагі.

Працы А.М. Латушкіна, у сваю чаргу, закранаюць метадалагічныя аспекты вывучэння так званага «дзяржаўнага архіва ВКЛ» [5, 6]. Даследчык пазначыў што сабой уяўляў гэты архіў, вызначае таксама яго дакументальны склад. Справа ў тым, што шмат арыгіналаў з гэтага архіва не захавалася да нашага часу. Вялікая іх колькасць была страчана яшчэ ў перыяд XV–XVIII ст.

Неабходна пазначыць працы беларускага даследчыка А.У. Ліцкевіча [7, 8]. Працы гісторыка адрозніваюцца вельмі высокім ўзроўнем вывучэння першакрыніц і іх археаграфічнай апрацоўкі. Аўтар у дачыненні да архіваў манархаў ВКЛ апошняй чвэрці XIV – першай трэці XV ст. некалькі разоў выкарыстаў тэрмін «архіў ВКЛ». У цэлым, у працах А.У. Ліцкевіча прасочваюцца наступныя тэрміны: «вяліка-княжацкі архіў ВКЛ», «дзяржаўны архіў ВКЛ», «вялікакняжацкая канцылярыя ВКЛ» [8, с. 44–45]. Але, на жаль, аўтар усё ж такі не пазначыў, што ён меў на ўвазе, і ў чым адрозненні паміж вялікакняжацкім архівам ВКЛ і дзяржаўным архівам ВКЛ у перыяд апошняй чвэрці XIV – першай трэці XV ст. Гэты стан рэчаў адлюстроўвае існуючую неўпарадкаванасць у тэрміналогіі праблемы. Разам з тым, некаторыя тэрміны даследчыка ў дачыненні да эпохі Вітаўта нам падаюцца спрэчнымі. Напрыклад, тэрмін «архіў ВКЛ». Справа ў тым, што ў гэты перыяд існавала іншая сістэма кіравання дзяржавай. Многія прадстаўнікі тытулаванай знаці мелі свае прыватныя архівы, якія часам утрымлівалі важкія акты агульнадзяржаўнага значэння. Яскравым прыкладам з'яўляецца Андрэй Альгердавіч і Свідрыгайла Альгердавіч.

Падсумаваўшы, можна дакладна сцвярджаць, што сярод даследчыкаў не існуе ўніверсальнага падыходу да класіфікацыі архіва Вітаўта Кейстутавіча, таксама не было вынесена прапановы рэканструкцыі ўласна самаго архіва Вітаўта. Апошняе – відавочна, так як сярод даследчыкаў няма дакладнага ўяўлення, што такое «архіў Вітаўта». Даследчыкі не вызначылі дакументальны склад гэтага архіва, таму што шмат дакументаў, якія патэнцыяльна маглі ўваходзіць у гэты архіў яшчэ

не апублікаваны, і многія знаходзяцца ў архівах Германіі, Літвы, Латвіі, Аўстрыі, Расіі і Польшчы. Падзел яго канцылярыі на аддзелы, прапанаваны М. Косманам, быў праведзены па моўным асаблівасцям выходнай дакументацыі прыватнай канцылярыі манарха.

Перад тым, як даць кароткую характарыстыку дакументальнага складу прыватнага архіва Вітаўта Кейстутавіча, неабходна вызначыць, што такое архіў манарха. Архіў манарха – гэта збор featureнага віду пісьмовых крыніц, якія адклаліся ў выніку дзейнасці манарха і яго карэспандэнтаў. Да апошніх, у сваю чаргу, адносяцца: стрыечны брат Уладзіслаў II Ягайла, Папа Рымскі Марцін V, дачка Вітаўта Соф'я, магістры Тэўтонскага Ордэна, а таксама яго ландмайстарства ў Лівоніі, дацкі, швецкі і нарвежскі кароль Эрык Памеранскі і інш. Архіў Вітаўта ўмоўна можна падзяліць на дзве часткі: архіў уваходнай дакументацыі і архіў канцылярыі. Да пытанняў, якія павінны быць высветлены ў далейшых працах у першую чаргу адносяцца: час стварэння прыватнай канцылярыі Вітаўта; дакументальны склад архіва; пытанне наконт копій як уваходнай, так і выходнай дакументацыі.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Білецька, О.* Поділля на зламі XIV-XV ст.: до витоків формування історичної області: монографія. – Одеса: Астропринт, 2004. – 416 с.
2. *Груша А. И.* Документальная письменность Великого Княжества Литовского (конец XIV – первая треть XVI в.) / НАН Беларуси, Центральная научная библиотека им. Я. Коласа. - Минск: Беларуская навука, 2015. - 465 с.
3. *Груша, А. И.* «Хранить вечно». Архивы Великого княжества Литовского конца XIV –первой трети XVI в. / А. И. Груша // Исторический вестник. – 2014. – Т. 6. – С. 6–53.
4. *Купчиньский, О. А.* Акти та документи Галицько-Волинського князівства XIII – першої половини XIV століть: Дослідження. Тексти. - Львів, 2004.
5. *Латушкін, А. М.* Комплекс арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва Вялікага Княства Літоўскага ў расійскай дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі: тэрміналагічны аспект праблемы / А.М. Латушкін // Беларускі археаграфічны штогоднік.–2019.–Вып. 20.– С. 63–85 (ВАК).
6. *Латушкін, А. М.* Тэрміналагічнае афармленне комплекса арыгіналаў актаў агульнадзяржаўнага значэння архіва Вялікага Княства Літоўскага ў польскай гістарычнай навуцы і архівазнаўстве міжваеннага перыяду / А. М. Латушкін // Архіварыус: Зб. навук. паведамл. і арт. – Вып. 17. – Мінск: НГАБ, 2019.– С. 80–97. (ВАК).
7. *Лицкевич, О. В.* «Летописец великих князей литовских» и «Повесть о Подолье»: опыт комплексного критического разбора. СПб.: Дмитрий Буланин, 2019. — 928 с., 16 с. [цв. вкл.] — (Studiorum slavicorum orbis; вып. 16).
8. *Ліцкевіч, А.* Дагаворы паміж князямі ВКЛ, нобілямі Жамойці і прадстаўнікамі Тэўтонскага ордэна ў Прусіі і Лівоніі (1367-1398 гг.) / А. Ліцкевіч // Arche. 2010, № 10 (Грунвальдскі нумар). – с. 39 – 123.

9. *Полехов, С. В.* Загадка грамоты Витовта (Vitoldiana, № 11): XIV или XIX век? // Slovene. 2018. Vol. 7. № 2. С. 451 – 476.
10. Полоцкие грамоты XIII - начала XVI века / Подготовили А.Л. Хорошкевич (отв. ред.), С.В. Полехов (зам. отв. ред.), В.А. Воронин, А.И. Груша, А.А. Жлутко, Е.Р. Сквайрс, А.Г. Тюльпин. Т. 1. Москва, 2015. 864 с.
11. Полоцкие грамоты XIII - начала XVI века / Подготовили А.Л. Хорошкевич (отв. ред.), С.В. Полехов (зам. отв. ред.), В.А. Воронин, А.И. Груша, А.А. Жлутко, Е.Р. Сквайрс, А.Г. Тюльпин. Т. 2. Москва, 2015. 522 с.
12. *Пятраўскас, Р.* Фармаванне інстытуцыйнага двара вялікага князя ў Літве (XIV – пачатак XV ст.) / Р. Пятраўскас // Arche. Пачатак. – 2009. – № 9. – С. 39–71.
13. *Рыбакоў, А.* Арганізацыя дзяржаўнага архіва Вялікага княства Літоўскага ў XVI ст. /А. Рыбакоў // Архівы і справаводства. – 1999. – № 2. – С. 70–76.
14. *Čapaitė, R.* Gotikinis kursyvas Lietuvos didžiojo kunigaikščio Vytauto raštinėje /R. Čapaitė; Lietuvos istorijos institutas. – Vilnius: Versus aureus, 2007. – 544 p.
15. *Čapaitė, R.* List jako narzędzie komunikacji wielkiego księcia litewskiego Witolda / R. Čapaitė // Studia Źródłoznawcze = Commentationes / PAN, Instytut historii. – Warszawa: Wydawnictwo «DiG», 2012. – T. 50. – S. 41–56.
16. Codex epistolaris Vitoldi Magni Ducis Lithuaniae. 1376 – 1430 / collectus opera A. Prochaska. Kraków : Druk Wł. L. Anczyca i sp., 1882. 1114 s.
17. *Daniłowicz, I.* Skarbiec diplomatów papiezkich, cesarskich, krolewskich, książęcych. T. 1. Wilno, 1860.
18. *Jablonskis, K.* Naujy Vytauto Laikotarpio Aktai // Praetis. Kaunas, 1933. T. 2. P. 375 – 411.
19. *Jakubowski, J.* Przywilei Witolda dla Kowna 1408 // J. Jakubowski/ Ateneum Wilenskie. 1930. R. 7. Z. 3—4. S. 840-845.
20. *Jakubowski, J.* Archiwum państwowe W. X. Litewskiego i jego losy / J. Jakubowski //Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawam archiwalnym. – Warszawa: Wydawnictwo archiwów państwowych, 1931. – T. 9. – S. 1–18.
21. *Kosman, M.* Archiwum kapituły Wileńskiej / M. Kosman // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawam archiwalnym / Organ naczelnej dyrekcji archiwów państwowych. – Warszawa, 1976. – T. 64. – S. 37–57.
22. *Kosman, M.* Archiwum wielkiego księcia Witolda / M. Kosman // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawam archiwalnym / Organ naczelnej dyrekcji archiwów państwowych. – Warszawa, 1967. – T. 46. – S. 129–138.
23. *Kosman, M.* Dokumenty łacińskie wielkiego księcia Witolda / M. Kosman // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawam archiwalnym / Organ naczelnej dyrekcji archiwów państwowych. – Warszawa, 1969. – T. 51. – S. 73–89.
24. *Kosman, M.* Dokumenty wielkiego księcia Witolda / M. Kosman // Studia Żródłoznawcze = Commentationes / PAN, Instytut historii. – Warszawa, Poznań: Państwowe wydawnictwo naukowe. – 1971. – T. 16. – S. 139–169.
25. *Kosman, M.* Dyplomy Władysława Jagiełły dla Wielkiego księstwa Litewskiego / M. Kosman // Archeion. Czasopismo naukowe poświęcone sprawam archiwalnym / Organ naczelnej dyrekcji archiwów państwowych. – Warszawa, 1968. – T. 48. – S. 45–59.
26. *Kosman, M.* Kancelaria wielkiego księcia Witolda / M. Kosman // Studia Żródłoznawcze = Commentationes / PAN, Instytut historii. – Warszawa, Poznań: Państwowe wydawnictwo naukowe. – 1969. – T. 14. – S. 91–119.
27. *Kosman, M.* Polacy w Wielkim księstwie Litewskim. Z badań nad mobilnością społeczeństwa w dobie unii jagiellońskiej 1386–1569 / M. Kosman // Społeczeństwo

Polski średniowiecznej. Zbiór studiów / PAN, Instytut historii; pod red. S. K. Kuczyńskiego. – Warszawa: Państwowe wydawnictwo naukowe, 1981. – T. 1. – S. 347–378.
28. *Kosman, M.* W kancelarii wielkiego księcia Witolda / M. Kosman // Orzeł i Pogoń. Z dziejów polsko-litewskich XIV–XX w. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1992. – S. 102–142.
29. *Kurtyka, J.* Repertorium Podolskie. Dokumenty do 1430 roku // Kurtyka J. Podole w czasach jagiellónskich. Studia i materiały. Kraków : Wydawnictwo Towarzystwa Naukowego Societas Vistulana, 2011. S. 297 - 447
30. *Prochaska, A.* Dzieje Witolda Welkiego Ksiecia Litwy. Wilno : Ks. A. Rutkowski, 1914. 420 s.
31. *Semkowicz, W.* Nieznane nadania Witolda dla osob prywatnych / W. Semkowicz // Ateneum Wilenskie. 1930. R. 7. Z. 3—4. S. 845—858.
32. *Semkowicz, W.* Przywileje Witołda dla Moniwida – Semkowicz W. Przywileje Witołda dla Moniwida, starosty wileńskiego i testament jego syna Jana Moniwidowicza / W. Semkowicz // Ateneum Wileńskie. Czasopismo naukowe poświęcone badaniom przeszłości ziem W. X. Litewskiego. – Wilno, 1923. – R. 1. – № 2. – S. 253–267.
33. *Szybkowski, S.* Kancelaria wielkiego księcia Witolda w dobie wielkich konfliktów z Zakonem krzyżackim w latach 1409–1422. Organizacja, zadania, personel / S. Szybkowski // Kancelaria wielkich mistrzów i Polska kancelaria królewska w XV wieku. Materiały z międzynarodowej konferencji naukowej. Malbork. 2–3 IX 2004 / Muzeum Zamkowe w Malborku; pod red. J. Trupindy. – Malbork, 2006. – S. 299–318.
34. *Sochaniewicz, K.* Najdawniejsze dyplomy Witołda w. ks. Litewskiego (Przyczynek do dyplomatyki litewskiej) // Ateneum Wileńskie. R. 3. № 10-11. Wilno, 1925/1926
35. *Vitoldiana.* Codex privilegiorum Vitoldi, magni ducis lithuaniae, 1386–1430 / zebrał i wydał J. Ochmański. – Warszawa, Poznań: Państwowe wydawnictwo naukowe, 1986. – (Polska akademia nauk. Oddział w Poznaniu. Seria Historia. – T. 8). – 256 s.